# АДЧУВАЦЬ СУВЯЗЬ З МІНУЛЫМ

***Кажуць, што менавіта людзі ствараюць гісторыю. Яскравы прыклад гэтага – жыццё і дзейнасць вядомага дзяржаўнага дзеяча, выпускніка нашай альма-матэр Пятра Машэрава.***





На здымку: удзельнікі інтэлектуальнай гульні.



На здымку: падчас мерапрыемстваў у Расонах.

Сёлета адзначаецца 105 гадоў з дня нараджэння Пятра Міронавіча. У нашым універсітэце да гэтай значнай даты быў прымеркаваны Тыдзень памяці, у рамках якога прайшло шмат разнапланавых мерапрыемстваў, якія былі аб'яднаны дэвізам 2023 года – мір і стварэнне.

Пра некаторыя з іх распавяду больш падрабязна.

### Удзел дэлегацыі ВДУ ў раённых урачыстых мерапрыемствах у г.п. Расоны

Дэлегацыя ВДУ на чале з рэктарам Валянцінай Багатыровай прыняла ўдзел ва ўскладанні кветак да падножжа помніка падпольшчыкаў, расстраляных у 1942 годзе, сярод якіх была і маці Пятра Міронавіча. Затым машэраўцы адправіліся ў Расонскую школу, якая носіць імя П.М. Машэрава. Там яны пазнаёміліся з выставай рэдкіх фотаздымкаў нашага земляка і сустрэліся з людзьмі, якія яго ведалі.

«Паездка ў Расоны была для мяне запамінальнай падзеяй. Гэты гарадскі пасёлак можна назваць маёй малой радзімай і, безумоўна, як і любы чалавек, я адчуваю хваляванне, калі вяртаюся туды. Было прыемна пабачыць знаёмыя месцы і сваіх землякоў. Да таго ж гэтая паездка дапамагла паглядзець на Пятра Міронавіча з іншага боку. Раней я ведаў яго толькі як палітычнага дзеяча, а тут пачуў аб ім як аб простым чалавеку. А дапамаглі мне ў гэтым мясцовыя жанчыны. Яны былі знаёмыя з Пятром Міронавічам і кранальна ўспаміналі аб гэтым. Ад іх шчырых і добрых слоў момантамі нават мне хацелася плакаць.

Я ўпэўнены, што маладому пакаленню трэба ўдзельнічаць у падобных мерапрыемствах, бо кожны чалавек павінен адчуваць сваю сувязь з мінулым», – адзначыў Багдан Кузьмін, студэнт 1 курса ФГіМК.

### Дзейнасць Народнага мемарыяльнага музея ВДУ

У гэтым годзе Тыдзень памяці П.М. Машэрава для Народнага мемарыяльнага музея нашага ўніверсітэта быў асаблівым.

Для студэнтаў і навучэнцаў Ліцэя ВДУ Вольга Пуцеева, загадчык музея, педагог дадатковай адукацыі, праводзіла экскурсіі. У фае першага паверха была арганізавана выстава «Лідэры эпохі. П.М. Машэраў», на якой былі прадстаўлены стэнды з біяграфіяй нашага земляка, успамінамі яго сяброў і аднагрупнікаў. Дарэчы, у Народным мемарыяльным музеі ВДУ ёсць і асабістыя рэчы Пятра Міронавіча. Гэта яго лётны шлем, карта і нататнік з запісамі.

«Я ўпэўнена, што гістарычная памяць – гэта не толькі глабальныя падзеі, якія прыводзяць у рух велізарныя масы людзей. Гэта гісторыя тваёй сям'і, родных і блізкіх, твайго горада ці вёскі.

Лічу, што трэба памятаць, якія намаганні прыкладаюцца ў кожны перыяд часу, каб краіна жыла і развівалася. Любы гістарычны этап адметны па-свойму, заўсёды ёсць дасягненні, якімі можна ганарыцца.

З аповедаў людзей, якія ведалі Пятра Міронавіча, я даведалася, што ён быў чалавекам, адданым сваёй справе, адкрытым, сціплым і гатовым прыйсці на дапамогу. Яго суразмоўца заўсёды ведаў, што будзе пачуты», – расказала Таццяна Вісоцкас, студэнтка 2 курса ФГіМК.

«Я ўпершыню наведала Народны мемарыяльны музей ВДУ. І магу сказаць, што экскурсія была вельмі цікавай. У музеі захоўваецца шмат экспанатаў, якія дапамагаюць лепш адчуць эпоху, пра якую расказвала экскурсавод. Дзякую Вользе Уладзіміраўне, што мы дазналіся столькі новых фактаў з біяграфіі Пятра Міронавіча.

Я лічу, што маладому пакаленню вельмі важна паглыбляцца ў вывучэнне гісторыі, каб рабіць высновы, браць прыклад і раўняцца на такіх герояў, як Пётр Машэраў», – адзначыла Лада Балло, студэнтка 1 курса ФМіІТ.

### Інтэлектуальная гульня, прысвечаная жыццю і дзейнасці П.М. Машэрава

У ёй прынялі ўдзел студенты першага курса і навучэнцы Ліцэя ВДУ.

Па словах вядучага Аляксандра Серады, пытанні ён распрацоўваў сам, карыстаючыся матэрыяламі, якія размешчаны на сайце ВДУ і ў іншых крыніцах.

Як лічыць Аляксандр, самым складаным было пытанне аб колькасці ордэнаў Леніна ў Пятра Міронавіча. А вось дзе ў Віцебску ўстаноўлены бюст П.М. Машэрава, ведалі ўсе студэнты і навучэнцы Ліцэя.

«Падчас падрыхтоўкі да гульні я і сам дазнаўся шмат новага аб такой гістарычнай асобе, як Пётр Машэраў. Напрыклад, што пры кіраўніцтве Пятра Міронавіча было закладзена метро ў Мінску.

Вельмі парадавала, што шмат машэраўцаў прынялі ўдзел у гульні. Прыемна было бачыць знаёмых студэнтаў, якія займаюцца ў клубе інтэлектуальных гульняў, кіраўніком якога я з'яўляюся», – адзначыў Аляксандр.

**Падрыхтавала Алеся МЯДЗІЛЬ.**
**Здымкі Наталлі ТАРАРЫШКІНАЙ.**

Падрабязней аб Тыдні памяці Пятра Машэрава глядзіце з дапамогай QR-кода.